где западные влияния были наиболее сильными, рассматриваемое оружие широкого распространения не получило. Наибольшее количество находок в Понемонье припадает на XIV в. – время активности орденцев в регионе. При этом в общих соотношениях в комплексе оружия дальнего боя арбалет значительно уступал луку. В условиях отсутствия в рассматриваемых регионах, за единичными исключениями, крупных коллекций болтов, невозможности датировки находок на основании стратиграфического положения хронологическая интерпретация арбалетных стрел в контексте контактов северо- и западноевропейских рыцарей представляется возможной. А сами арбалетные наконечники стрел являются единственной категорией находок в материальной культуре поселений на территории Беларуси, которая напрямую свидетельствует о контактах местного населения с крестоносцами. Познакомившись с передовыми технологиями военно-технологической мысли, местное население территории Беларуси перешло от своего традиционного лучного вооружения сразу к огнестрельному, а местные воины в XIV–XV вв. оставались в большинстве своем архаично вооруженными, несмотря на незначительные проявления западноевропейских тенденций.

БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ СПИСОК

[1] См.: Медведев А. Ф. Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. // Свод археологических источников. М., 1966. Вып. Е1-36. С. 92–95.
[2] См.: Rackevičius G. Arbaletas ir lankas Lietuvoe XIII–XVI a. Vilnius, 2002.
[3] См.: Плавинский В. А. О времени появления арбалета на западе Белорусского Подвинья // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В. В. Седова : материалы 57-го заседания (18–20 апр. 2011 г.). М. ; Псков, 2011. С. 210–224.
[4] См.: Алексеев Л. В. Полоцкая земля: Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. М., 1966. С. 174.
[5] См.: Stryjkowski M. O poczatkach, wywodah, dzielnosciach, Sprawach rycerskich i domowych slawnego narody litewskiego, zemojdzkiego i ruskiego. Warszawa, 1978.
[6] См.: Латвийский Генрих. Хроника Ливонии. М. ; Л., 1938. С. 91.
[7] Там же.
[8] См.: Медведев А. Ф. Ручное метательное оружие…
[9] См.: Клімаў М. В. Новыя звесткі аб раскопках запалоцкага пасада г. Полацка (па выніках раскопак 2008 г.) // Віцебскія старажытнасці. Мінск, 2010. Мал. 2: 5, 6.
[10] См.: Дук Д. У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2011. Вып. 21. Мал. 7: 2.
[11] См.: Штыхов Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.). Минск, 1975. Рис. 30: 7, 18.
[12] См.: Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.). Минск, 1978. С. 78.
[13] См.: Варонін В. А. Падзеі 1307 года ў Полацку: спроба крытычнага разбору // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 2009. С. 30 ; Сагановіч Г. М. Полацк і Нямецкі ордэн: ад вайны да васалітэта і саюза // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 2009. С. 147.
[14] См.: Зверуго Я. Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. С. 111.
[15] См.: Воронин Н. Н. Древнее Гродно // Материалы по археологии и истории. М., 1954. С. 166.
[16] См.: Медведев А. Ф. Ручное метательное оружие... С. 166.
[17] См.: Гурэвіч Ф. Д. Летапісны Навагрудак. СПб. ; Наваградак, 2003. С. 171.
[18] См.: Трусаў А. А., Краўцэвіч А. К., Сагановіч Г. М. Металічныя вырабы з раскопак Лідскага і Мірскага замкаў (XIV–XVIII стст.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. Мінск, 1987. № 4. С. 73–83.
[19] См.: Краўцэвіч А. К. Гарады и замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст. Мінск, 1991. Мал. 36: 20.
[20] См.: Краўцэвіч А. А. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. Ржэшув, 2000. С. 173–176.
[21] Там же.
[22] См.: Лысенко П. Ф. Берестье. Минск, 1985. С. 222–224.
[23] См.: Бохан Ю. М. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. М., 2002. С. 176.
[24] См.: Загорульский Э. М. Возникновение Минска. Минск, 1982. С. 218 ; Заяц Ю. А. Оборонительные сооружения Менска XI–XIII вв. Минск, 1996. С. 69.

Поступила в редакцию 05.09.2014.

Владимир Александрович Плавинский – аспирант кафедры археологии и специальных исторических дисциплин. Научный руководитель – доктор исторических наук, заведующий кафедрой археологии и специальных исторических дисциплин А. А. Егорейченко.

УДК 94(438)«16»:930(476)+327(438)(091)«16»:930(476)

А. В. ДЗЕМІДОВІЧ

СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Посвящена рассмотрению современной белорусской историографии внешней политики Речи Посполитой. Отмечается, что внешняя политика Речи Посполитой долгое время не являлась объектом особого исследовательского интереса. Приобретение независимости Республикой Беларусь содействовало обращению к истории внешней политики Великого княжества Литовского, Речи Посполитой и активизировало научные исследования в данном направлении. Определены основные тенденции, которыми характеризуется современная белорусская историография внешней политики Речи Посполитой. Автор очертил спектр вопросов, которые интересуют исследователей, а также те аспекты, которые лишены должного внимания. Отмечен вклад отдельных историков в процесс становления историографической традиции вопроса; выделены периоды современной историографии и определены их особенности.

Ключевые слова: белорусская историография; внешняя политика; международные отношения; Речь Посполитая; Российское государство; Швеция; Османская империя; дипломатия; война.

The article is devoted to the contemporary Belarusian historiography of the foreign policy of the Polish-Lithuanian Commonwealth. Till recently the foreign policy of the Polish-Lithuanian Commonwealth has not attracted much academic interest. The formation of the Republic of Belarus as an independent state provided the deeper research of the foreign policy of the Polish-Lithuanian Commonwealth and Grand Duchy of Lithuania and furthered academic research of this field. The author defined the main tendencies that characterize the contemporary Belarusian historiography of the foreign policy of the Polish-Lithuanian Commonwealth as well as the range of problems that gained much attention or on the contrary were overlooked. The contribution of the particular researchers was emphasized. The periods of the contemporary historiography and their peculiarities were specified.

Key words: Belarusian historiography; foreign policy; international relations; the Polish-Lithuanian Commonwealth; Russian State; Sweden; Ottoman Empire, diplomacy; war.

Айчынная гістарыяграфія не характарызуецца багатай традыцыяй даследавання знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай. Не з’яўляецца выключэннем і сучасная гістарыяграфія, якая, як прынята, адлічваецца з пачаткам 1990-х гг., што абумоўлена важнымі палітычнымі зменамі: прыняццем Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, атрыманнем незалежнасці нашай дзяржавы, распадам СССР.

Безумоўна, з набыццём незалежнасці Рэспублікай Беларусь па шэрагу аб’ектыўных прычын знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) і Рэчы Паспалітай стала аб’ектам навуковага інтарэсу. Гэта тлумачыцца ў некаторай ступені адыходам ад ідэалагічных догмаў, негалосным зняццем забароны на даследаванне пытанняў «чыстай» палітыкі, у тым ліку і знешняй, атрыманнем даследчыкамі пэўнай свабоды ў выбары тэм. Акрамя таго, неабходнасць звароту да даследавання палітычнай гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай дыктуецца самім часам. Наяўнасць у Рэспубліцы Беларусь глыбокіх традыцый дзяржаўнасці дапамагае абгрунтаваць і ўмацаваць дзяржаўную ідэнтычнасць і правасуб’ектнасць у міжнародным супольніцтве. Для самастойнай Беларусі, адносна маладой незалежнай дзяржавы, якая замацавала ўласны статус як паўнапраўнага суб’екта міжнародных адносін, доказ даўно сфарміраваных традыцый палітычнай культуры, у тым ліку і ў знешнепалітычнай сферы, з’яўляецца дастаткова важным.

Аднак, нягледзячы на неабходнасць і новыя магчымасці даследавання, знешняя палітыка Рэчы Паспалітай па-ранейшаму застаецца не такой ужо і даследаванай старонкай гісторыі, а яе гістарыяграфія значна саступае ў гэтым плане гістарыяграфіі, прысвечанай знешняй палітыцы ВКЛ як самастойнага дзяржаўнага ўтварэння.

Зразумела, што 1990-я гг. былі своеасаблівым пачаткам, першымі крокамі беларускай гістарыяграфіі ў распрацоўцы тэм, якія былі занядбаны ў савецкія часы або характарызаваліся тэндэнцыйнасцю падачы матэрыялу, а таксама ацэнкамі і высновамі. І трэба прызнаць, што гэтыя крокі былі досыць паспяховымі.

Адным з першых, хто зрабіў рэтраспектыўны разгляд і аналіз гісторыі геапалітыкі Беларусі, хоць і ў межах навуковых артыкулаў, быў А. П. Грыцкевіч. Яго артыкулы ў часопісе «Спадчына» пад назвай «Гісторыя геапалітыкі Беларусі», апублікаваныя ў 1994 г., – гэта аналіз знешняй палітыкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай XIII–XVIII стст. Аўтар ахарактарызаваў важнейшыя вектары знешняй палітыкі (былі ўзгаданы амаль усе значныя знешнепалітычныя падзеі, у якіх прымала ўдзел Рэч Паспалітая), адзначыўшы пры гэтым змены ў іх рэалізацыі, якія адбываліся з цягам часу[1].

Гэты час быў адзначаны выхадам у свет манаграфій Г. М. Сагановіча «Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стст.» і «Невядомая вайна: 1654–1667 гг.». Першая – «Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стст.»[2] – прысвечана разгляду гісторыі ўзброеных сіл ВКЛ XVI–XVII стст. У сваім даследаванні аўтар дае адказ на пытанні: якая была арганізацыя, структура войска ВКЛ і як гэта ўплывала на яго баяздольнасць у канкрэтных гістарычных абставінах. Такім чынам, знешнепалітычныя рэаліі выступаюць фонам, прызваным садзейнічаць пошуку адказаў на пастаўленыя пытанні. У кнізе ёсць раздзел «Войска ў баявых дзеяннях», дзе на канкрэтных прыкладах – гістарычных падзеях – разглядаецца тактыка войска ВКЛ. І хоць праца Г. М. Сагановіча належыць да разраду даследаванняў па галіне гісторыі вайсковасці, тым не менш для асэнсавання знешняй палітыкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай (іх няўдач і дасягненняў) яна мае істотнае значэнне.

З’яўленне манаграфіі «Невядомая вайна: 1654–1667 гг.»[3] стала сапраўды знакавай падзеяй для беларускай гістарыяграфіі ў сілу таго, што ў ёй прадстаўлены новы погляд на вайну Расійскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай. Акрамя таго, гэта першае манаграфічнае даследаванне ў айчыннай гістарыяграфіі, дзе з’ява знешнепалітычнага характару вылучана ў самастойны аб’ект даследавання. Аўтарам разглядаюцца перадумовы, ход ваеннага канфлікту (прычым звяртаецца асаблівая ўвага на падзеі, якія мелі месца на беларускіх землях), пазіцыя і паводзіны насельніцтва Рэчы Паспалітай падчас вайны, яе вынікі для Беларусі. Даючы ацэнку трынаццацігадовай вайне, Г. М. Сагановіч адзначае яе пагубныя наступствы для Рэчы Паспалітай. «Невядомая вайна» з’явілася артыкуляцыяй навуковага погляду з нацыянальных пазіцый, а таксама сапраўднай рэвізіяй і крытыкай папярэдніх гістарыяграфічных поглядаў і стэрэатыпаў.

Характэрная рыса гістарыяграфіі перыяду 1990-х гг. – з’яўленне навукова-папулярных прац, прысвечаных асобным прадстаўнікам палітычнай эліты ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Неабходна адзначыць працы І. В. Саверчанкі, М. М. Чарняўскага, у якіх апавядаецца аб жыццёвых шляхах Астафея Валовіча, Льва Сапегі, Яна Караля Хадкевіча. У некаторай ступені разглядаецца і іх знешнепалітычная дзейнасць. Так, напрыклад, у кнізе «Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега» І. В. Саверчанка ўдзяліў увагу раз-

гляду дыпламатычных місій Льва Сапегі ў 1584 і 1600–1601 гг. у Маскву; замежнай палітыцы падчас трэцяга бескаралеўя ў Рэчы Паспалітай; адносінам Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай у Смутны час[4]. У дадзенай працы дзейнасць Льва Сапегі ў ажыццяўленні ўсходняга вектара знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай прадстаўлена значна больш, чым астатнія кірункі. У гісторыка-біяграфічным нарысе «Астафей Валовіч» утрымліваюцца звесткі, а таксама іх аналіз пра знешнепалітычную дзейнасць падканцлера ВКЛ[5].

Жыццёвы шлях і ваенна-палітычная дзейнасць Яна Караля Хадкевіча аналізуюцца ў працы М. М. Чарняўскага «Правадыр крылатых вершнікаў: Ян Кароль Хадкевіч». Гетман ВКЛ Ян Кароль Хадкевіч здолеў праявіць свой талент военачальніка на ўсіх актуальных у канцы XVI – пачатку XVII ст. для Рэчы Паспалітай кірунках знешняй палітыкі – паўночным, усходнім, паўднёвым. М. М. Чарняўскі ўдзяляе больш увагі паўночнаму кірунку знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай у пачатку XVII ст. і ўкладу Хадкевіча ў змаганне са Швецыяй, акцэнтуе ўвагу на бітве пад Кірхгольмам 1605 г.[6] Удзел Хадкевіча ў інтэрвенцыі Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву, узначальванне федэратыўных сіл падчас Хацінскай вайны таксама былі не абмінуты ўвагай даследчыка. Падкрэсліваецца ўклад Яна Караля Хадкевіча ў развіццё гусарскіх войск Рэчы Паспалітай[7].

Нягледзячы на статус усіх адзначаных вышэй выданняў – навукова-папулярныя, – іх з'яўленне ў 1990-я гг. было адназначна дастаткова прагрэсіўнай з'явай, якая абуджала цікавасць да гісторыі роднага краю і спрыяла яе далейшаму вывучэнню.

У сярэдзіне 1990-х гг. з'яўляюцца акадэмічныя «Нарысы гісторыі Беларусі»[8], дзе ў агульнай канве гісторыі Беларусі адведзена ўвага і яе знешнепалітычнай гісторыі. Варта прызнаць, што да асвятлення падзей знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай падыход быў выбарачны. Не ўсе ключавыя падзеі адзначанага перыяду знайшлі асвятленне на старонках выдання. Напрыклад, праігнараваны падзеі знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай першай трэці XVII ст. Існуе толькі раздзел, прысвечаны войнам і ўнутрыпалітычным канфліктам сярэдзіны XVII – XVIII ст., які пачынаецца з разгляду казацка-сялянскай вайны і працягваецца выкладам падзей вайны 1654–1667 гг. Складаныя і неадназначныя адносіны Рэчы Паспалітай з Асманскай імперыяй засталіся па-за ўвагай аўтараў выдання.

У 1996 г. пачаў выдавацца спецыялізаваны часопіс «Белорусский журнал международного права и международных отношений» (з 2005 г. – «Журнал международного права и международных отношений»), заснавальнікам і выдаўцом якога з'яўляецца Міжнароднае грамадскае аб'яднанне па навукова-даследчых і інфармацыйна-адукацыйных праграмах «Развіццё». На старонках выдання асвятляюцца актуальныя праблемы знешняй палітыкі і міжнароднага права. Неабходна падкрэсліць, што на сённяшні дзень гэта адзінае спецыялізаванае выданне ў Рэспубліцы Беларусь, якое з'яўляецца «форумам» для спецыялістаў у галіне міжнародных адносін, міжнароднага права і міжнародных эканамічных адносін. Публікуе часопіс артыкулы, прысвечаныя і міжнародным адносінам Новага часу. Аднак колькасць публікацый па гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Рэчы Паспалітай на старонках дадзенага часопіса ўвогуле нешматлікая, а ў перыяд 1996–2000 гг. іх было толькі 2: «Внешнеполитический механизм и организация дипломатической службы Речи Посполитой и Великого княжества Литовского в 1569–1795 гг.»[9] А. В. Ціхамірава і артыкул В. І. Бобышава і А. А. Яноўскага «Международные отношения в Восточной и Центральной Европе XVI в. в интерпретации польской историографии»[10], які прысвечаны гістарыяграфічнаму аспекту.

У красавіку 1999 г. на факультэце міжнародных адносін БДУ адбылася навуковая канферэнцыя «Дыпламатыя і дзяржаўны пратакол на Беларусі». Па яе выніках быў выдадзены першы том альманаха «Беларусь і свет»[11]. Як адзначыў Л. В. Лойка, на той час загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы БДУ, сярод шматлікіх прычын, якія з'явіліся падставай для выдання альманаха, былі такія, як «неабходнасць распрацоўкі гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі», і, «нарэшце, вялікая цікавасць да сучаснай знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь і неабходнасць асэнсавання месца Беларусі ў свеце»[12]. Па праблемах знешняй палітыкі і дыпламатыі Рэчы Паспалітай у склад зборніка ўвайшлі артыкулы А. А. Яноўскага «"Вайна нерваў", ці Характар дыпламатычнай перапіскі паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у XVI ст.», А. В. Ціхамірава «Порядок приема зарубежных посольств и ведения дипломатических переговоров в Речи Посполитой (2-я половина XVI – XVII в.)», Л. Л. Міхайлоўскай «Дипломатическая служба Речи Посполитой в XVII в.», В. І. Бобышава «Некаторыя аспекты арганізацыі дыпламатычных перамоў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у другой палове XVI ст.»[13].

Неабходна сказаць, што менавіта ў 1990-я гг. пачала фарміравацца беларуская школа міжнародных даследаванняў, у праблемным полі якой сёння знаходзяцца, безумоўна, пытанні, звязаныя з гісторыяй знешняй палітыкі Беларусі, а значыць ВКЛ, а таксама Рэчы Паспалітай. Акрамя таго, з'явіліся і сталі выкладацца ў БДУ такія дысцыпліны, як «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», «Гісторыя дыпламатычнай службы Беларусі», «Гісторыя міжнародных адносін».

Такім чынам, у перыяд 1990-х гг. была асэнсавана неабходнасць правядзення даследаванняў па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі і быў зроблены пэўны задзел у дадзеным кірунку.

У канцы 1990-х гг. пачынаецца больш інтэнсіўнае даследаванне знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай. Стала выразна прасочвацца спецыялізацыя даследчыкаў на канкрэтных тэмах і перыядах.

Даследаваннем войнаў XVII ст., апрача іншага, займаецца Г. М. Сагановіч. Даследчыка цікавяць стаўленне шляхты ВКЛ да войнаў XVII ст. і іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё; становішча ВКЛ падчас

канфліктаў; дзейнасць вайсковых канфедэрацый. Г. М. Сагановіч адзначае непапулярнасць войнаў сярод грамадства ВКЛ. Асаблівая ўвага была адведзена падзеям Смутнага часу. Вынікі працы даследчыка над акрэсленай праблематыкай знайшлі адлюстраванне ў шэрагу артыкулаў і адпаведных раздзелах навукова-папулярнага выдання «Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя»[14]. Неабходна адзначыць, што ў беларускай гістарыяграфіі амаль не асвятляўся такі этап канфрантацыі Расійскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай, як Смаленская вайна 1632–1634 гг. Г. М. Сагановіч прысвяціў некалькі артыкулаў (у адным з іх утрымліваецца публікацыя крыніцы – інструкцыі ашмянскага сойміка 1632 г.) дадзенай праблематыцы, разгледзеўшы асобныя эпізоды ходу вайны, а таксама ўнутры- і знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай на яе пярэдадні[15].

У 2000-х гг. актыўна звяртаецца да даследавання ўласна палітычнай гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай П. А. Лойка. Сферай навуковага інтарэсу гісторыка сталі працэс фарміравання шляхецкага саслоўя і яго ўдзел у дзяржаўна-палітычным жыцці краіны. Так, успрыманню грамадствам ВКЛ разнастайных праблем дзяржаўнага жыцця, у тым ліку і знешняй небяспекі, прысвечана манаграфія «Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст.» і шэраг артыкулаў[16]. Працы П. А. Лойкі вылучаюцца разуменнем факта існавання розніцы паміж інтарэсамі шляхты ВКЛ і Каралеўства Польскага, што абумоўлівала іх адпаведную пазіцыю адносна знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай у XVI–XVII стст.

2007 г. для беларускай (і не толькі) гістарыяграфіі быў адзначаны выхадам у свет манаграфіі А. М. Янушкевіча «Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг.». Новы падыход аўтара да праблемы адлюстраваны, між іншым, у самім тэрміне – «інфлянцкая» замест традыцыйнага «лівонская». Прапаноўвае аўтар і ўласную перыядызацыю канфлікту 1558–1582 гг., вылучаючы перыяд 1558–1570 гг. у асобную падзею і вайну. Даследчыкам разгледжаны знешнепалітычнае становішча ВКЛ у адзначаны перыяд, непасрэдна ваенныя дзеянні і дыпламатычныя кантакты, а таксама ўплыў вайны на функцыянаванне важнейшых дзяржаўных інстытутаў – войска, казны. Характарызуецца ўздзеянне фактару вайны на шляхецкую свядомасць і ўспрыманне насельніцтвам ваеннага ліхалецця[17].

Адносіны Рэчы Паспалітай (і ВКЛ як яе складовай часткі) са Швецыяй даследуе А. Катлярчук, які жыве і працуе ў Швецыі. Асаблівую ўвагу даследчык удзяліў XVII ст., зрабіўшы акцэнт на аналізе месца ВКЛ у палітыцы Швецыі і Расіі сярэдзіны XVII ст.[18]

З канца 1990-х гг. пачалі абараняцца кандыдацкія дысертацыі па праблемах міжнародных адносін ранняга Новага часу, знешняй палітыкі і дыпламатыі ВКЛ, а таксама Рэчы Паспалітай. З 2001 г. па сённяшні дзень па тэмах, якія маюць дачыненне да вышэйзгаданага і закранаюць перыяд існавання Рэчы Паспалітай (1569–1795), абаронены наступныя кандыдацкія дысертацыі: В. І. Бобышава «Международные отношения в Восточной Европе в 30–80-е гг. XVI в.» (2001); В. І. Лазоркінай «Дипломатическая служба Великого Княжества Литовского во внешнеполитическом механизме Речи Посполитой в 1600–1697 гг.» (2009); А. К. Шымак «Внешнеполитические приоритеты России во взаимоотношениях с Римской курией (1469–1582 гг.)» (2010); А. В. Дземідовіч «Вялікае Княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.» (2012); В. У. Якубава «Інфлянты ў знешняй і ўнутранай палітыцы ВКЛ у канцы XVI – пачатку XVII ст.» (2013)[19]. Па назвах дысертацыйных прац можна меркаваць аб сферы навуковых інтарэсаў адзначаных даследчыкаў.

У 2003–2004 гг. з'явіўся двухтомны вучэбны дапаможнік У. Е. Снапкоўскага, прысвечаны гісторыі знешняй палітыкі Беларусі: ад знешнепалітычных стасункаў старажытнабеларускіх дзяржаў-княстваў да дзейнасці Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне. У першым томе дапаможніка разглядаецца знешняя палітыка і знешнепалітычны механізм Рэчы Паспалітай[20]. Дадзенае выданне – адзіная абагульняючая праца па гісторыі знешняй палітыкі розных форм беларускай дзяржаўнасці.

Гісторыя знешнепалітычных канфліктаў перыяду Рэчы Паспалітай працягвае знаходзіць адлюстраванне на старонках навукова-папулярных выданняў. Напрыклад, кнігі А. Я. Тараса «Войны Московской Руси с Великим Княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках», В. Чаропкі «Геркулес, Руды і Пярун (Радзівілы-пераможцы)», «Лёсы ў гісторыі: нарысы»[21].

Прыкметна, што Рэч Паспалітая ў знешнепалітычных рэаліях XVIII ст. менш даследавана. Праблемы Паўночнай вайны і становішча ВКЛ падчас яе даследуе У. І. Пашкевіч, аналізуючы ўнутрыпалітычныя праблемы ВКЛ, якія фарміраваліся пад уплывам знешнепалітычных фактараў[22].

Паколькі ў гэты час Рэч Паспалітая з'яўлялася ўжо не суб'ектам, а аб'ектам знешняй палітыкі, дадзены факт значна звужае поле даследавання гісторыкаў знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай XVIII ст. Тым не менш знешняя палітыка – гэта не толькі войны і ўзброеныя канфлікты, але таксама і дыпламатыя. Менавіта апошняя як форма рэалізацыі знешняй палітыкі ў XVIII ст. застаецца маладаследаванай беларускімі гісторыкамі.

Аднак пэўнае асвятленне праблем знешнепалітычнага характару мы знойдзем у напрацоўках тых даследчыкаў, якія займаюцца палітычнай гісторыяй XVIII ст.

Напрыклад, у кандыдацкай працы Д. В. Віцько «Міжусобная барацьба магнацкіх груповак у Вялікім княстве Літоўскім у канцы XVII – пачатку XVIII ст.» разглядаюцца асаблівасці ўступлення ў Паўночную вайну ВКЛ і Рэчы Паспалітай і стаўленне палітычна актыўнай часткі грамадства да ўдзелу ў ёй; аналізуецца арыентацыя магнацкіх груповак на Швецыю і Расію[23].

Перыяду падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэнню беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі прысвечана даследаванне Я. К. Анішчанкі «Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай»[24]. У працы разглядаецца палітыка расійскай улады ў адносінах да Рэчы Паспалітай, накіраваная на імкненне ўсталяваць пратэктарат, аналізуецца механізм уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

У манаграфіі А. У. Мацука «Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.)» аналізуецца ўплыў расійскай і французскай дыпламатыі на ўнутрыпалітычныя працэсы ў Рэчы Паспалітай[25].

У згаданых даследаваннях знешняя палітыка Рэчы Паспалітай не з’яўлялася ні аб’ектам, ні прадметам даследаванняў, але пэўныя аспекты разглядаюцца і аналізуюцца аўтарамі ў рэчышчы разгляду тых асноўных праблем, якім прысвечаны працы.

Падводзячы вынік, заўважым, што перыядызацыя сучаснай гістарыяграфіі дадзенай праблемы (як і любой іншай) умоўная: 1990-я гг. – пачатак звароту да гісторыі знешняй палітыкі; канец 1990-х гг. – сённяшні дзень, калі яскрава асэнсаваны важнасць і неабходнасць вывучэння знешняй палітыкі і міжнародных адносін Новага часу, а таксама вызначэння ролі і месца беларускіх зямель у гэтых працэсах. Нягледзячы на наяўнасць навуковага інтарэсу да праблем знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай, застаецца маларaспрацаваным шэраг праблем і пытанняў, якія чакаюць сваіх даследчыкаў (напрыклад, адносіны Рэчы Паспалітай з Асманскай імперыяй; удзел Рэчы Паспалітай у Трыццацігадовай вайне; ажыццяўленне заходняга вектара знешняй палітыкі і інш.). З’яўляецца таксама актуальным пытанне аб распрацоўцы метадалогіі даследавання знешнепалітычных праблем мінулага або адаптацыі тых метадаў, якія прапаноўвае тэорыя міжнародных адносін і якія ўзяты на ўзбраенне даследчыкамі сучасных міжнародных адносін і знешняй палітыкі. Відавочна, што гісторыя знешняй палітыкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай, з’яўляючыся арганічнай часткай гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі як дысцыпліны, так і сукупнасці падзей, якія разгортваюцца ў прасторы і часе, можа стаць самастойным перспектыўным кірункам даследаванняў.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

[1] Гл.: Грыцкевіч А. П. Гісторыя геапалітыкі Беларусі // Спадчына. 1994. № 1. С. 85–93 ; № 3. С. 39–51.
[2] Гл.: Сагановіч Г. М. Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XV–XVII стст. Мінск, 1994.
[3] Гл.: Сагановіч Г. М. Невядомая вайна: 1654–1667 гг. Мінск, 1995.
[4] Гл.: Саверчанка І. В. Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега. Мінск, 1992. С. 13–17, 21–27, 52–60.
[5] Гл.: Саверчанка І. Астафей Валовіч : гіст.-біягр. нарыс. Мінск, 1992. С. 67–85.
[6] Гл.: Чарняўскі М. М. Правадыр крылатых вершнікаў: Ян Кароль Хадкевіч. Мінск, 1998. С. 19–36.
[7] Там жа. С. 28.
[8] Гл.: Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. Мінск, 1994. Ч. 1.
[9] Гл.: Тихомиров А. В. Внешнеполитический механизм и организация дипломатической службы Речи Посполитой и Великого княжества Литовского в 1569–1795 гг. // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1998. № 3. С. 52–61.
[10] Гл.: Бобышев В. И., Яновский О. А. Международные отношения в Восточной и Центральной Европе XVI в. в интерпретации польской историографии // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 1999. № 2. С. 40–43.
[11] Гл.: Беларусь і свет : альманах. 1999. Т. 1.
[12] Там жа. С. 3.
[13] Гл.: Яноўскі А. А. «Вайна нерваў», ці Характар дыпламатычнай перапіскі паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у XVI ст. // Беларусь і свет : альманах. 1999. Т. 1. С. 4–11 ; Тихомиров А. В. Порядок приема зарубежных посольств и ведения дипломатических переговоров в Речи Посполитой (2-я половина XVI – XVII в.) // Там жа. С. 19–27 ; Михайловская Л. Л. Дипломатическая служба Речи Посполитой в XVII в. // Там жа. С. 28–39 ; Бобышаў В. І. Некаторыя аспекты арганізацыі дыпламатычных перамоў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у другой палове XVI ст. // Там жа. С. 46–53.
[14] Гл.: Сагановіч Г. М. Шляхта Менскага ваяводзтва і інтэрвенцыйная вайна пачатку XVII ст. // Заслаўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. канф. «Гісторыя і культура Заслаўя ў святле агульнанацыянальных праблем» (Заслаўе, 11 лістап. 1995 г.). Заслаўе, 1997. С. 91–93 ; Яго ж. Шляхта Беларусі паміж Масквой і Каронай або войны XVII ст. як фактар дэцэнтралізацыі // Наш радавод. Кн. 8. Беларусы і палякі: дыялог народаў і культур X–XX ст. : матэрыялы Міжнар. круглага стала. Гродна, 1999. С. 118–124 ; Яго ж. ВКЛ і вайсковыя канфедэрацыі 1612–1614 гг. // Беларус. гіст. агляд. 2008. Т. 15, сш. 1–2. С. 100–122 ; Яго ж. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мінск, 2001.
[15] Гл.: Сагановіч Г. М. Вайна на полацка-віцебскім рубяжы ў 1632–1633 гг. і «паўстанне» ў Полацку // Беларус. гіст. агляд. 2011. Т. 18, сш. 1–2. С. 21–42 ; Яго ж. Інструкцыя паслам Ашмянскага павета на канвакацыйны сойм 1632 г. // Там жа. 2007. Т. 14, сш. 1–2. С. 207–219.
[16] Гл.: Лойка П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск, 2002 ; Яго ж. Соймікі беларускіх зямель у дзяржаўна-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай (апошняя трэць XVI – першая трэць XVII ст.) // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск – Навагрудак, 23–24 лістап. 2007 г.). Мінск, 2008. С. 176–182 ; Яго ж. Пазіцыя шляхты беларускіх зямель у знешнепалітычных стасунках Вялікага княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст. // III Няфёдаўскія чытанні «Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць» : зб. матэрыялаў рэсп. навук.-твор. канф. (Мінск, 19 сак. 2009 г.). Мінск, 2009. Т. 2. С. 11–18.
[17] Гл.: Янушкевіч А. М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. Мінск, 2007.
[18] Гл.: Катлярчук А. У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швецыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст. [Б. м.], 2009.
[19] Гл.: Бобышев В. И. Международные отношения в Восточной Европе в 30–80-е гг. XVI в. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.03, 07.00.15. Минск, 2001 ; Лазоркина О. И. Дипломатическая служба Великого княжества Литовского во внешнеполитическом механизме Речи Посполитой в 1600–1697 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.15. Минск, 2009 ; Шимак Е. К. Внешнеполитические приоритеты России во взаимоотношениях с Римской курией (1469–1582 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.03. Минск, 2010 ; Дземідовіч А. В. Вялікае Княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.15. Мінск, 2012 ; Якубаў В. У. Інфлянты ў знешняй і ўнутранай палітыцы ВКЛ у канцы XVI – пачатку XVII ст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2013.

[20] Гл.: Снапкоўскі У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін : у 2 ч. Мінск, 2003. Ч. 1 : Ад пачаткаў дзяржаўнасці да канца XIII ст.

[21] Гл.: Тарас А. Е. Войны Московской Руси с Великим Княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках. М. ; Минск, 2013 ; Чаропка В. Геркулес, Руды і Пярун (Радзівілы-пераможцы). Мінск, 2014 ; Яго ж. Лёсы ў гісторыі : нарысы. Мінск, 2005.

[22] Гл.: Пашкевіч У. І. ВКЛ у Паўночнай вайне (1700–1721) // Беларус. гіст. часоп. 1995. № 3. С. 163–171 ; Яго ж. Беларусь у Паўночнай вайне і паглыбленне палітычнага крызісу ў першай палове XVIII ст. // Гісторыя Беларусі : у 6 т. 2007. Т. 3. С. 104–119 ; Яго ж. Адлюстраванне падзей Паўночнай вайны ў актавых кнігах Аршанскага гродскага суда // Северная война 1700–1721 гг. и исторические судьбы Европы: к 300-летию со дня битвы при д. Лесная. Могилев, 2008. С. 208–217.

[23] Гл.: Віцько Д. В. Міжусобная барацьба магнацкіх груповак у Вялікім княстве Літоўскім у канцы XVII – пачатку XVIII ст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2007.

[24] Гл.: Анішчанка Я. К. Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. Мінск, 2003.

[25] Гл.: Мацук А. У. Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.). Мінск, 2010.

Паступіў у рэдакцыю 16.09.2014.

Алена Васільеўна Дземідовіч – кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў.

УДК 902/904(476):930(476)«18»+39(476):930(476)«19»

Г. А. КАРПЕЧАНКА

НАВУКОВЫЯ СУВЯЗІ КАНСТАНЦІНА І ЯЎСТАФІЯ ТЫШКЕВІЧАЎ З ТАВАРЫСТВАМ АМАТАРАЎ ПРЫРОДАЗНАЎСТВА, АНТРАПАЛОГІІ І ЭТНАГРАФІІ

Рассматриваются научные связи Константина и Евстафия Тышкевичей с Обществом любителей естествознания, антропологии и этнографии. Описываются результаты археологических и этнографических исследований, проводимых братьями Тышкевичами, которые были переданы обществу. Археологические находки и этнографические материалы были представлены на Русской этнографической выставке 1867 г. Общество любителей естествознания, позже названное Обществом любителей естествознания, антропологии и этнографии, высоко ценило деятельность братьев Тышкевичей в области археологии и этнографии. Свидетельством тому может служить переписка Константина Тышкевича с вышеуказанным обществом. Также коротко рассматривается история создания Общества любителей естествознания, антропологии и этнографии.

Ключевые слова: Константин Тышкевич; Евстафий Тышкевич; Общество любителей естествознания, антропологии и этнографии; Русская этнографическая выставка 1867 г.; археологические раскопки; этнографические исследования; Минский губернский статистический комитет.

This article discusses scientific communication Konstantin and Eustachy Tyszkiewicz with the Society of enthusiast of natural science, anthropology and ethnography. Describes the results of archaeological and ethnographic research, conducted by the brothers, and which were transferred to the Society. Archaeological and ethnographic materials were presented at the Russian ethnographic exhibition of 1867. Society of enthusiast of natural science, later called the Society of enthusiast of natural science, anthropology and ethnography highly valued activity brothers Tyshkevich in archaeology and ethnography. Evidence of this can serve as a correspondence Konstantin Tyszkiewicz with the above society. Also briefly discusses the history of the Society of enthusiast of natural science, anthropology and ethnography.

Key words: Konstantin Tyszkiewicz; Eustachy Tyszkiewicz; the Society of enthusiast of natural science, anthropology and ethnography; Russian ethnographic exhibition of 1867; archaeological excavation; ethnographic research; Minsk provincial statistical committee.

У XIX ст. на Беларусі з’яўляецца шэраг даследчыкаў, якія ствараюць навуковы падыход да вывучэння этналогіі, археалогіі, гісторыі. Сярод іх былі Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы з Лагойска. Браты займаліся археалагічнымі раскопкамі, зборам этнаграфічных звестак і фальклору, распрацоўкай музейнай справы. Яны імкнуліся не толькі да збору матэрыялу, але і да яго абагульнення, падвядзення вынікаў, стварэння метадалогіі. Сваёй навуковай дзейнасцю і значнымі дасягненнямі браты праславіліся як у родным краі, так і за яго межамі. Яны былі членамі шэрагу навуковых таварыстваў Вільні, Масквы, Рыгі, Парыжа, Лондана.

Таварыства аматараў прыродазнаўства пры Імператарскім Маскоўскім універсітэце было заснавана ў 1863 г.[1] і мела на мэце «изыскание средств, могущих содействовать распространению естествознания в России»[2]. Акрамя гэтага, праграма таварыства прадугледжвала правядзенне экскурсій, збор прыродазнаўчых і гістарычных рэчаў, распрацоўку дапаможнікаў па складанні калекцый для тых, хто займаецца прыродазнаўствам, давала паясненні ўніверсітэцкім зборам. У склад таварыства ўваходзілі знакамітыя, таленавітыя навукоўцы. Прэзідэнтам яго быў прызначаны прафесар геалогіі Г. Я. Шчуроўскі, віцэ-прэзідэнтам – прафесар матэматыкі А. Ю. Давідаў, сакратаром – захавальнік заалагічнага музея М. К. Зенгер. На чацвёртым пасяджэнні таварыства было прапанавана стварыць аддзел антрапалогіі, на чале якога адзін з заснавальнікаў таварыства А. П. Багданаў прапанаваў паставіць археолага Д. П. Сонцава[3]. Праз некалькі гадоў сваёй дзейнасці яно змяніла назву і стала Імператарскім таварыствам аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі. Таварыства займалася распрацоўкай праграм па збіранні этнаграфічных звестак і юрыдычных звычаяў[4]. З 23 красавіка па 19 чэрвеня 1867 г. яно праводзіла этнаграфічную выставу ў манежы ў Маскве[5]. На ёй былі прадстаўлены 288 манекенамі амаль усе народнасці ўсходніх, заходніх і паўднёвых славян з рэчамі іх побыту, 900 іншых этнаграфічных экспанатаў, каля 300 археалагічных знаходак, 600 чарапоў. Выставу наведваў імператар Аляксандр II з сям’ёй. Яна з’явілася падставай для правядзення славянскага з’езда і стварэння першага этнаграфічнага музея ў Маскве. Таварыства таксама праводзіла ў 1879 г. Маскоўскую антрапалагічную выставу[6]. Дзейнасць яго мела прагрэсіўны характар і спрыяла значнаму развіццю прыродазнаўчых навук у Расіі.